У даследаваннях падрыхтаваннага беларускага маўлення, праведзеных іншымі даследчыкамі і зробленых на матэрыяле запісаў мастацкіх твораў, выказвалася меркаванне пра іншыя тыпы і частотнасць ужывання акцэнтнарытмічных структур. Як найбольш частотныя былі выяўлены аднаакцэнтныя сінтагмы, агульная колькасць якіх складае 39 %. Двух- і трохацэнтныя сінтагмы сустракаюцца радзей і складаюць 33 % і 25 % адпаведна. Гэта можа быць растлумачана тым, што выкананне мастацкага твора характарызуецца прадуманай расстаноўкай лагічных і эмфатычных паўз, ужываннем уводных слоў накшталт *нарэшце*, *раптам*, *неўзабаве*. Іншая асаблівасць падрыхтаванага маўлення праяўляецца ў даволі рэдкім ужыванні чатырохакцэнтных і пяціакцэнтных сінтагм, толькі 3 % і 1 % адпаведна.

Дадзены эксперымент з мэтай аналізу жывой спантаннай гаворкі дазволіў выявіць тэндэнцыю да павелічэння працягласці найбольш ужывальных адзінак у параўнанні з даўжынёй акцэнтных груп падрыхтаванага маўлення. У той жа час адсутнасць пяціакцэнтных, цяжкіх для непадрыхтаванага маўлення сінтагм, сведчыць аб нетыповасці іх ужывання.

Такім чынам, асноўнымі рысамі акцэнтна-рытмічнай структуры спантаннага беларускага маўлення з'яўляюцца: ужыванне двух-, трох-, і чатырохакцэнтных сінтагм, адсутнасць аднаакцэнтных і пяціакцэнтных сінтагм, тэндэнцыя да больш частага ўжывання двух- і трохакцэнтных структур як адзінак сярэдняй даўжыні.

**В. У. Барысенка**

## АСАБЛІВАСЦІ ІСНАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ Ў НОВАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

Практычна ў кожную эпоху абмяркоўваліся ідэі гуманізму і справядлівасці, але кожны раз гэтыя ідэі напаўняліся новым зместам. Сёння межы гэтых паняццяў значна пашырыліся. Гэта пэўны лад чалавечага жыцця, у якім спалучаюцца маральныя і прававыя пачаткі, агульначалавечыя каштоўнасці, спосабы жыць у свеце людзей, не падобных адно да аднаго. Актуальным становіцца міжрэлігійны дыялог, павага да розных культурных і рэлігійных традыцый. Сацыёлагі задаюцца пытаннямі: што адбываецца ў сучасным свеце з чалавекам, яго светапоглядам, каштоўнаснымі ўстаноўкамі; наколькі гэтыя змены новыя (маецца на ўвазе, што «няма нічога новага пад сонцам»); што нясе чалавечай асобе інфармацыйнае грамадства?

Аналіз сацыялагічных даследаванняў апошняга часу дазваляе зрабіць вывад, што сістэма каштоўнасцяў і стэрэатыпаў, якая склалася на працягу тысячагоддзяў у Еўропе, у XXI ст. ужо не ў стане ў поўнай меры забяспечыць існаванне і прагрэс чалавечай цывілізацыі, перажываючы сур'ёзныя змены ва ўмовах глабалізацыі. Працэс секулярызацыі часта прыводзіць да страты неабходнасці вышэйшага духоўнага пачатку, сканцэнтраванага ў рэлігіі. У якасці дамінуючых каштоўнасных арыентацый сталі сцвярджацца

чыста ўтылітарныя і прагматычныя каштоўнасці: увага стала надавацца ў асноўным фізічнаму дабрабыту і назапашванню матэрыяльных даброт аў, сышло разуменне больш тонкага, больш высокага сэнсу жыцця. Для характарыстыкі сучаснай грамадскай сітуацыі сацыёлагі прапаноўваюць паняцце «свет каталога». Яно дэманструе чалавека як асобу, сэнс жыцця якой у лёгкім і бесперапынным здзяйсненні новых і новых пакупак. Сучасныя тэхналогіі камунікацыі не маюць межаў, аўтарытэтаў, часта слаба рэгулююцца заканадаўствам. СМІ ўжо даўно ўладары свядомасці людзей, яны дыктуюць уніфікацыю думак, пачуццяў, прыярытэтаў. Сітуацыя складваецца так, што маніпуляваць свядомасцю спажыўцоў, і асабліва маладых спажыўцоў, стала вельмі проста. Зняволены чалавек ужо не здольны да самастойнага мыслення, меркавання і ўчынкаў. Назіраецца парадаксальная сітуацыя: з аднаго боку, глабалізацыя нівелюе нарматыўна-каштоўнасныя арыенціры, падпарадкоўвае чалавека разрэкламаваным, растыражаваным ідэям. Многія сацыёлагі, асабліва з лагера рускага праваслаўя, гавораць пра духоўны крызіс, страту маральнага імператыву, неабходнасць удзелу царквы як гаранта духоўна-маральнага фундаменту ў грамадскім жыцці краіны. Яны бачаць неверагодную пагрозу ў з'яўленні новай інфармацыйнай рэальнасці, заклікаюць сваіх апалагетаў адмовіцца ад карыстання сучаснымі гаджэтамі. Пры гэтым, з другога боку, вялікая колькасць людзей адмаўляецца ад дыктату тэлевізійнага кантэнту, актыўна жыве і кантактуе ў інтэрнэт-прасторы, стварае крэатыўныя стартапы, падчас крызісных грамадскіх сітуацый (напрыклад, пандэмія 2020 г.) праяўляе найлепшыя чалавечыя якасці ўзаемадапамогі і спачування.

Сучасная рэлігійная сітуацыя характарызуецца такой з'явай, як «рэлігіі новага стагоддзя» («Нью-Эйдж») – зборнага паняцця ўсіх канфесійных новаўтварэнняў. Гэта і адраджэнне старых рэлігійных практык, і з'яўленне шматлікіх нетрадыцыйных рэлігій, спецыфічных духоўных практык. Вельмі часта можна назіраць, што паняцце талерантнасці губляе сваё традыцыйнае разуменне і становіцца поўнай нейтральнасцю, бесканфліктнасцю.

Актыўнае пакаленне постсавецкага часу, адмаўляючы старыя догмы і забароны, шукала сябе, свой голас, свайго Бога. З 90-х гадоў пачынаецца сапраўднае адраджэнне хрысціянства (праваслаўнай царквы, касцёла, пратэстанцкіх цэркваў). Літаратура, натуральна, адлюстроўвала гэтыя пошукі, але часцей гэтае богашукальніцтва не абмяжоўвалася неабходнасцю прыналежнасці да пэўнай канфесіі. Прыкметы гісторыка-культурнай сітуацыі, якая атрымала назву «постмадэрнізм», выразна назіраюцца ў творчасці беларускіх паэтаў ды і ва ўсёй грамадскай сітуацыі краіны. Гэта адчуванне пераходнасці, крызіснасці, вычарпанасці быцця. Як і ў Еўропе 60-х гадоў, беларускія паэты прымяняюць прынцып дэканструкцыі, парадыруючы творы класічнай літаратуры і нават тых аўтараў, аўтарытэт якіх і сёння застаецца неаспрэчным. (“А хто там ня йдзе?” Ігара Сідарука як алюзія на купалаўскі “А хто там ідзе”). Для таго каб ствараць такія дэканструкцыі, літаратурныя калажы, прымяняць прыём інтэртэкстуальнасці, трэба мець хуткі і лёгкі доступ да тэкстаў. І сённяшняя інфармацыйная рэчаіснасць надзвычай спрыяе такой

творчасці, яна ж рыхтуе і адэкватнага чытача гэтых тэкстаў. Дзякуючы Інтэрнэту чатач-шукальнік можа расшыфраваць крыніцы алюзій, знайсці першакрыніцы, стаць сапраўдным удзельнікам гульні, распачатай аўтарам твора. Аўтар і чытач няспынна павышаюць сваю эрудыцыю, культуралагічную і філалагічную. Можна прывесці прыклады творчасці Андрэя Хадановіча ці Юрася Барысевіча. Паэты ўдзельнічаюць у шматлікіх перфомансах, і з'явы пазалітаратурнага жыцця становяцца працягам, неад'емным элементам іх творчасці. Можна сказаць, што літаратура перастала замыкацца сама на сабе.

Літаратуразнаўцы, асабліва айчынныя, задаюцца пытаннем, ці выжыве літаратура ў новай інфармацыйнай рэальнасці. Сапраўды, мы назіраем, як трансфармуецца характар сацыякультурных камунікацый і змяняюцца каналы распаўсюджвання мастацкіх твораў, з'яўляецца новая эстэтыка, заснаваная на паняццях інфармацыйнай эпохі. Беларуская літаратура надзвычай актыўна асвойвае інтэрнэт-прастору. Пра ролю пісьменніцкіх блогаў у сучасным айчынным літаратурным працэсе пісалі Л. Алейнік і М. Аляшкевіч. Пісьменнікі вядуць інтэрнэт-блогі, створаны шматлікія літаратурныя сайты, старонкі ў фэйсбук, літаратурныя інтэрнэт-суполкі: «Сучасная беларуская літаратура», «Я ♥ дзядзьку Караткевіча», «Максіма Багдановіча» (http://vk.com/club6071256), http://litara.net/, http://kamunikat.org/, http://knihi.com/, http://krytyka-by. livejournal.com/, http://lit-krytyka.livejournal.com/ (сучасная літаратурная крытыка, літаратурная журналістыка, літаратуразнаўства, кніжныя агляды), http://by-litara. livejournal.com/, http://bellib.net/ (беларуская літаратура ў перакладах на замежныя мовы і замежная літаратура ў перакладах на беларускую мову), асабістыя сайты пісьменнікаў (http://www.arlou.org/, http://balachonau.puls.by/). І. Шаўлякова-Барзенка ў артыкуле «Беларуская літаратура ў інфармацыйным грамадстве: пагрозы як гарантыя перспектыў» сцвярджае, што існаванне беларускай літаратуры ў новай інфармацыйнай рэальнасці задаецца двума восевымі параметрамі: у пачатку XXI стагоддзя беларуская літаратура захоўвае тыпалагічныя адзнакі літаратуры класічнага тыпу, але новая інфармацыйная рэальнасць якасна змяняе ўмовы функцыянавання лірыкі. Беларуская паэзія характарызуецца складанасцю, шматфарбнасцю, markdown розностылёвасцю, станаўленнем форм і жанраў літаратуры найноўшага часу. Гэта незакончаны працэс, паэты працягваюць пошукі новых шляхоў спасціжэння рэчаіснасці. Сёння у паэзіі вылучаецца значна больш мастацка-стылявых плыняў параўнальна з папярэднімі перыядамі яе развіцця: лірыка-апавядальная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная і ўніверсальна-філасофская.

Такім чынам, на нашу думку, сучасная сацыяльная сітуацыя мала чым адрозніваецца ад мінулых. Ва ўсе часы прыкладна 6 % грамадства было актыўным, арыгінальным, забяспечвала як тэхнічны і маральны прагрэс, так і духоўную ўстойлівасць супольнасці. Сёння проста змяніліся сродкі, магчымасці, павялічылася хуткасць ва ўсіх сферах жыцця. І паэзія як самы ёмісты, рухомы, чуйны жанр літаратуры актыўна асвойвае гэтыя заваёвы навукова-тэхнічнага прагрэсу.